№ 21 (470)
Чэрвень 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
www.bfk.by

У нумары:

☞ Кантэкст: *«Новая зямля» і сусветная літаратура –* стар. 2

☞ Рэгіён: *Лепельшчына – край старажытны –* стар. 4

☞ Паселішча: *маёнтак братоў Казлоўскіх і вёска Паянычы –* стар. 7–8

Калі гучыць песня

Пра тое, што Касцюковіччына багатая на музычныя таленты, ведаюць не толькі мясцовыя аматары добрай песні. Музычныя творы ў выкананні нашых артыстаў гучаць далёка за межамі раёна, кранаючы сэрцы і простых слухачоў, і прафесійнага журы. Пра гэта кажуць добрыя вынікі ўдзелу касцюкаўчанаў у рэспубліканскіх, рэгіянальных і абласных конкурсах.

Самых высокіх вынікаў дасягнулі нашыя артысты на міжрэгіянальным фестывалі-конкурсе патрыятычнай песні «Дарогамі вайны», што адбыўся напярэдадні святкавання Дня Перамогі ў вёсцы Гардзееўка Бранскай вобласці ў Расіі. Фэст праходзіў з мэтаю выяўлення і падтрымкі таленавітай творчай моладзі і выканаўцаў усіх узроставых катэгорыяў. Для кожнага ўдзельніка была адна ўмова: грамадска-патрыятычная тэматыка песень аб Вялікай Айчыннай вайне.

Восем раёнаў з Гомельскай, Магілёўскай і Бранскай абласцей прынялі ўдзел у конкурсе. З кожнага рэгіёну на фестываль прыехалі па пяць-шэсць калектываў і сольных выканаўцаў. Музычную Касцюковіччыну прадстаўлялі народны вакальны ансамбль «Альянс», спявачка Юлія Бяспалава і салістка ўзорнай эстраднай студыі «Д.Т.П.» Лізавета Чыграй.

Ансамбль «Альянс»

Вынікі конкурсу апраўдалі ўсе спадзяванні! Прызёрам фестывалю, уладальніцай дыплому другой ступені ва ўзроставай намінацыі да 18 гадоў стала Лізавета Чыграй. Маладая спявачка прадставіла на суд журы песню «Ты помнишь». У намінацыі ад 18 да 30 гадоў перамога дасталася выдатнай вакалістцы Юліі Бяспалавай. Яна ўразіла журы і слухачоў сваім непараўнальным голасам, вобразам, сцэнічным майстэрствам, манераю выканання твору «Любоў і радасць – Беларусь». Пераможцам у намінацыі ад 30 гадоў быў прызнаны народны вакальны ансамбль «Альянс». Шмат добрых водгукаў пачулі ўдзельніцы ансамбля і ад журы, і ад кіраўнікоў іншых калектываў. Слухачы, уражаныя прафесійным выкананнем песні «Балада аб маці», не скупіліся на апладысменты. Гарманічным было ўсё: сцэнічныя касцюмы, эстэтыка паводзінаў на сцэне і эмацыйная напружанасць, якую салісткі вытрымалі ад пачатку і да апошніх акордаў і змаглі перадаць усёй зале.

Гэта далёка не першае творчае дасягненне ансамбля «Альянс». Кожны год папаўняецца скарбонка яго поспехаў. Не так даўно ансамбль прывёз дыплом за вялікую працу па прапагандзе і развіцці харавога мастацтва і за актыўны ўдзел у фестывалі «Ад Шчырага сэрца» (г. Жодзіна), прысвечаным памяці знакамітага харавога дырыжора і кампазітара Эдуарда Шчырага.

У нашых артыстаў ёсць мэты, імкненне да самаўдасканалення, прафесіяналізм і, безумоўна, талент. А чалавеку з сукупнасцю такіх якасцяў скараюцца любыя творчыя вяршыні.

Наталля ДРОБЫШАВА,
кіраўнік народнага аматарскага аб'яднання «Літаратурная гасцёўня "Крынічка"»,
г. Касцюковічы

Параўнанне з мэтай адшукаць агульнае

На ўтульнай гасцёўні Коласавага музея 23 мая ў чарговы літаратурны чацвер сабраліся прыхільнікі паэтычнага слова песняра Якуба Коласа і прозы класіка французскай літаратуры Эміля Заля.

Таццяна Мархель

Да 90-годдзя першага выдання паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа музеем сумесна з кандыдатам філалагічных навук Таццянай Студзенка – даследчыцай беларускай і замежнай літаратуры, выкладчыкам Інстытута журналістыкі БДУ – падрыхтаваны Міжнародны літаратурны праект «Зямля – аснова ўсёй Айчыне». Яго мэта – пошук літаратурных паралеляў «Новай зямлі» з творамі пісьменнікаў іншых краінаў. У праекце запланаваныя пяць вечарынаў. Першая сустрэча была прысвечаная раману-паэме «Старая новая зямля» Тэадора Герцэля. Гэтым разам з «Новай зямлёю» Якуба Коласа параўноўвалі раман «Плённасць» Э. Заля. Чаканыя і нечаканыя паралелі ў творах літаратараў разам з Т. Студзенка шукалі народная артыстка Беларусі Таццяна Мархель, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, народны мастак Беларусі Васіль Шаранговіч, сын песняра Міхась Міцкевіч, паэт, перакладчык, літаратуразнаўца і бард Андрэй Хадановіч.

Напачатку шаноўныя госці вечарыны падзяліліся думкамі пра тое, што для іх родная зямля. Для Т. Мархель гэта вёска Шпакоўшчына ў Смалявіцкім раёне, народныя песні, звычаі, абрады, калыханкі, вяртанне ва ўспамінах у дзяцінства, а У. Гілеп узгадаў сваю хату ў вёсцы Востраў на Капыльшчыне.

Прысутныя даведаліся, што ідэя падарункавага 3-моўнага выдання «Новай зямлі» належала Янку Брылю. Кніга была падрыхтаваная і выдадзеная Беларускім фондам культуры да 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа; адказную працу па стварэнні 91-й ілюстрацыі да паэмы выканаў Васіль Шаранговіч. Яго мастацкія вобразы герояў паэмы даволі пазнавальныя. Свае адметнасці мае вобраз маці: на кожнай ілюстрацыі яна розная. Мастак намагаўся ўвасобіць у ёй рысы шматлікіх жанчынаў, каб кожны мог знайсці нешта ад сваёй маці. Як заўважыў Міхась Міцкевіч, працы мастака добра адлюстроўваюць змест паэмы, урыўкі з якой у яго майстэрскім выкананні прысутныя слухалі з асаблівай увагай.

Таццяна Студзенка

Пасля Міхась Канстанцінавіч выказаў думкі наконт прыгажосці і мілагучнасці беларускай мовы, хараство якой ва ўсёй паўнаце можна пачуць у радках паэмы бацькі:

– Я вызначыў для сябе, што беларуская мова – самая прыгожая сярод славянскіх. Калі гаварыць пра еўрапейскія мовы, то для мяне асабіста беларуская на трэцім месцы пасля італьянскай і французскай. Далей ідуць украінская, руская і польская. Дай Бог, каб нашыя дзеці чыталі як мага больш, вывучалі літаратурнае багацце, якое назапашанае, ёсць у бібліятэках і на нашых з вамі кніжных паліцах.

Змястоўнае падрабязнае параўнанне твораў Коласа і Заля прадставіла Т. Студзенка. Яна нагадала некаторыя старонкі жыцця Э. Заля, якога яго сябра Анатоль Франс назваў «самым моцным лірыкам нашага часу». Даследчыца вызначыла канцэптуальную агульнасць абодвух твораў:

– І там, і там – духоўная агульнасць тэмы зямлі.

Прасочваючы лёс галоўнага героя рамана Заля, які праз шмат пакутаў набывае ўласны надзел зямлі, паступова ператварае яго ў квітнеючы ўрадлівы край з красамоўнай назвай Шантэбле (*з франц.* «песня нівы»), выступоўца выяўляе ўзаемасувязі ўрадлівасці глебы і нараджальнасці, адзінства зачацця і сяўбы, адзінства пладавітасці, урадлівасці, плённасці, адзінства стварэння, адзінства малака маці і сокаў зямлі. Таму невыпадкова сучаснікі літаратара пад-крэслівалі вартасць рамана менавіта як паэмы – паэмы жыцця. Ідэі дэкадансу па абмежаванні колькасці дзяцей у творы Э. Заля супрацьстаіць прагнасць да жыцця. Абмя-жоўваць іх колькасць – здра-джваць каханню і жыццю. Ён паэтызуе землеўладанне як жыццятворчасць ва ўскосным і літаральным сэнсе. У паэме Коласа землеўладанне су-працьпастаўленае нядолі, бядоце, марнатраўству быцця, творчай няплоднасці. Таму раман Э. Заля з'яўляецца сюжэтным працягам Коласавага твора.

Васіль Шаранговіч

Глыбокія навуковыя разважанні пра духоўны і філасофскі сэнс землеўладання ў літаратурных творах класікаў дапоўніў А. Хадановіч. Ён прачытаў свае пераклады на беларускую мову вершаў Гіёма Апалінера (які паходзіць з беларускага роду Кастравіцкіх, адкуль і Карусь Каганец), Шарля Бадлера, выканаў песні на пераклады вершаў Сержа Гінзбурга, падзяліўся паэтычнымі ўражаннямі ад адвечнай чароўнасці Парыжа. Завяршылася вечарына цудоўным папуры з твораў беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў. Атмасферу Францыі дапамагалі ствараць выканаўцы тэатра французскай песні «Каравела».

Працягам тэмы стануць разгляд твораў Крысціёнаса Данелайціса «Чатыры пары года» і Баграта Шынкубы «Рассечаны камень».

Наш кар.
Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Тэатр французскай песні «Каравела»

На тым тыдні...

✓ **27 мая** ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна прайшла **прэзентацыя кнігі Галіны Каржанеўскай «Што варта радасці і слёз...»**, напісаная ў жанры «Біяграфія ў вершах і нарысах». Аўтар распавядае пра Случчыну, дзе нарадзілася Г. Каржанеўская, і Лагойшчыну, дзе яна сталела і пачала працоўны шлях. У мерапрыемстве бралі ўдзел людзі, жыццё якіх звязанае з гэтымі рэгіёнамі, калегі і сябры аўтаркі, сярод якіх – пісьменніца Раіса Баравікова. А настрой гасцям ствараў гурт «Сёмуха».

✓ **28 мая** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылося **адкрыццё выстаўкі «Славацкія сустрэчы Янкі Купалы»**. Яна распавядае пра малавядомую старонку з жыцця паэта: яго вандроўку ў Славакію ў складзе дэлегацыі савецкіх пісьменнікаў і журналістаў у 1935 годзе.

✓ **29 мая** ў філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь «Гасцёўня Уладзіслава Галубка» распачала працу **выстаўка «Нацыянальныя музычныя інструменты Славакіі»**, арганізаваная сумесна з Літаратурным і музычным музеем Славакіі ў горадзе Банска Быстрыца.

✓ **29 мая** ў мінскай галерэі «Ў» прайшла **выніковая вечарына-сустрэча навучэнцаў Школы маладога пісьменніка «Параходзік сучаснасці»**. Школа працавала цягам года пры ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў». *Падрабязней пра імпрэзу чытайце ў наступным нумары.*

✓ **1 чэрвеня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адзначылі Міжнародны дзень аховы дзяцей **«Дзіцячым фестывалем 2013»**. Пад час свята маленькія наведнікі змаглі не толькі пазнаёміцца з экспазіцыямі музея, але і ўзяць удзел у адмыслова для іх падрыхтаваных майстар-класах і мерапрыемствах.

Неабыякавы погляд Юрыя КЛЕВАНЦА

Перадавыя тэхналогіі нарыхтоўкі дроваў у Асіповіцкім раёне

У 2011 годзе аўтар гэтых радкоў напісаў ліст у Міністэрства культуры, дзе прапанаваў даследаваць з мэтай пошуку гістарычных і этнаграфічных каштоўнасцяў дамы з закінутых паселішчаў, якія не маюць гаспадароў і ўсё роўна ідуць пад знос паводле рашэнняў мясцовых уладаў.

І той зварот, і адказ на яго (звычайная бюракратычная адпіска) былі надрукаваныя ў адным з сакавіцкіх нумароў «Краязнаўчай газеты» таго ж 2011 года. Але ж, як вядома, папяровыя плыні цякуць па сваіх рэчышчах, а рэальнае жыццё крочыць сваім шляхам. У гэтым рэальным жыцці справы звычайна ідуць не так, як гэта бачаць аматары «знізу» ці чыноўнікі «зверху». Вось і канчатковы лёс хатаў, якія пустуюць, часцей за ўсё вырашаецца «на месцы», без усялякага ўдзелу працаўнікоў «культурнага фронту» ці сельсаветаў.

Цяпер, бадай, у любой гаспадарчай краме можна набыць мотапілу. Вось вяскоўцы з яшчэ жывых вёсак і аграгарадкоў і набываюць перадавую замежную тэхніку, а потым, каб зэканоміць грошы, не замаўляюць дровы ў лясгасах і адпаведных камунальных службах, а проста выразаюць піламі сцены закінутых хатаў.

Такім чынам вельмі хутка ўсе пабудовы былых вёсак знікнуць самі сабою, без якіх-небудзь намаганняў адміністрацыі. А калі нічога няма, то і рабіць нічога не трэба, і даследаваць таксама няма чаго. Можна спакойна займацца папяровымі справамі. Што і патрабавалася даказаць.

Фота, якое прапаную чытачам газеты, зробленае ў вёсцы Слопішча Асіповіцкага раёна. Але ж і ў іншых вёсках можна ўбачыць тое ж самае.

На фота аўтара: папрацавалі пілой

Зноў «чорныя капальнікі»

SOS! У Асіповіцкім раёне працягваецца разбурэнне помнікаў старажытнасці – курганных могільнікаў. Свежыя сляды саматужных незаконных раскопак выяўленыя аўтарам радкоў на могільніку каля вёскі Радуцічы. Пахаванні XII–XIII стагоддзяў, якіх яшчэ 50 гадоў таму было некалькі дзясяткаў, пачалі інтэнсіўна разбурацца з 1990-х. Цяпер тут, бадай, не засталося ніводнага кургана, які б не быў пашкоджаны. Вось і яшчэ адзін помнік старажытнасці не дачакаўся сваіх навукоўцаў-даследчыкаў...

На фота Д. САЎРЫЦКАГА: капалі зусім нядаўна

Імёны балотаў

Прайдзі-праедзь па Лунінеччыне – праз кожныя пару кіламетраў, а то і нераздзельным ланцугом сустрэнуцца балоты ці хоць невялікая забалочаная нізіна. І ў кожнага, нават нязначнага, аб'екта маецца найменне. Бывае, назва простая, зразумелая, трапна пасуе да ландшафту дадзенай мясціны, а ёсць, што і блізка няма падабенства і зусім незразумелая.

Маюцца назвы, што з'явіліся даўным-даўно і нясуць прыкметы таго часу, калі ўзніклі. Да прыкладу, балоты Залессе ці Татарка або Лёмно і Бэрлёнэ[1]. Каля Залесся цяпер лесу і блізка няма, а калісьці ж быў; татарскія набегі канулі ў Лету, а назва сведчыць аб даўняй падзеі. А што азначае Лёмно і Бэрлёнэ, і калі з'явіліся назвы – загадка.

На Лунінеччыне больш за дзвесце балотаў, ад вялікіх масіваў, такіх, як Грычын, Хваецкае, да малых, у некалькі гектараў, напрыклад: Лаза, Корчыкі.

Перш чым сказаць, як даваліся балотам імёны, па якіх прыкметах іх «хрысцілі», зазначым, што старажытныя людзі ўсё сваё жыццё праводзілі на прыродзе, у тым ліку каля балотаў, і заўважалі кожную дэталь адрознення аднаго аб'екта ад другога. Тое, што для сучаснага чалавека ўсяго толькі «балота», для старажытнага рознілася: балонне, г**а**ла, грузін**а**, дрыгва, багна, твань, нетра, д**ы**хля, струга, куп'е. Напрыклад: Пеўнева (Піўнёво) Балота, Плеса, Царовэ Куп'е, Раманюковы Вокны, Баранова Струга, Оболонне, Багно, Мшок.

Шмат якія балотныя аб'екты ў раёне маюць назву «мох». Мох – старажытная агульнаславянская назва балота, і такое найменне мясціны сведчыць аб вельмі даўняй назве аб'екта: Наўдзіцкі Мох, Гневанскі Мох, Сухі Мох, Вялікі Мох, Дубін Мох і г.д.

Да калектывізацыі ўся зямля належала ўласнікам. Вялікія балотныя абшары былі падзеленыя на людскія дзялкі ці надзелы, а малыя па плошчы балоты ў большасці сваёй належалі аднаму гаспадару. Таго гаспадара даўно ўжо няма, а памяць у назве тапоніма захавалася па яго прозвішчы ці мянушцы: Нікайскае, Карпава, Полхава, [Бул**ы**човэ][2] Балота, Конюхаў Лес, Гарбаровэ і Захаровэ Куп'е, Раманюковы Вокны, Сцяблецкія, Курылаўшчына, Евіно, Б**а**бінэ і Бабінэ Балота, Дундашчынэ.

Цікавыя назвы, у якіх адгукаецца гісторыя, нейкая падзея, месца, звязанае з заваёўнікамі ці чужымі насельнікамі: Шляхецкі Мох, Варшава (надзел Варшаўскага), Княжыставічы, Ябланёў Лясок (хутар Яблоньскага), Татарскія Брады, Татарка. Хаця назву Татарка маглі даць балоту па яго гіблым месцы, дзе гінулі людзі і жывёла.

Мінаў час, адбываліся падзеі, якія пакідалі след у тапонімах, у тым ліку ў найменнях балотаў. Так, у час Першай сусветнай вайны з ваеннай мэтай была пракладзеная дарога з Лахвы ў Давыд-Гарадок – насыпаная высокая дамба ўздоўж ракі Смердзь. Гэтую дарогу і ўсё балота, што прылягае да насыпу, назвалі Вал.

У выніку зямельных рэформаў пры Польшчы з'явіліся назвы: Дварэцкае Балота і Цнянскае, Вічынскія Сенакосы, Аральшчыны Папова і Людская, Перадзел; у працэсе лесанарыхтовак і распрацовак участкаў узніклі Посеч, Обруб, Будчанка, Церабеж, [Росцерэб], Посеч, [Нов**а**ціны], Навін**а**; на меліяраваных землях у наш час з'явіліся Гектары, Сёмае Поле, Задамбай. Сімвалам назвы станавіліся і шляхі зносінаў: Масцечна, Пуцішча, Чаўнавішча, Зімнік.

Па найменні аб'екта можна даведацца аб знаходжанні карысных выкапняў на тутэйшых балотах: [Торфіско], Глінішчэ, [Балілішчэ] (залежы мелу). На тарфяных аб'ектах здараліся пажары, перад якімі тагачасныя людзі былі бездапаможнымі, і выгаралі ўчасткі, пакінуўшы пасля сябе непрыемны след: Вогнішчэ, [Пожарэ].

Балотам давалі назвы па месцы іх знаходжання: Зазер'е, Падбярэзнікі, [Пэсчаніца], Далёкая Струга, [Заліпэцок], Падрэчкаю, Калашырокае, Зазерскэ, Падлессе, [Загацкэ] (за гаццю), Падмаліннік, Дальні Хобат і Бліжні, Заланьскэ, Заморочна, [Заровэц] (за ровам), Замоствічы.

Тыя балоты, што размясціліся ў лясным тупіку ў вузкай, абмежаванай лесам ці ўзгоркамі прасторы, носяць назвы: Прыслон, Зад**ы**, [Совін Вугол], Шпілька, Цвікі Рог, Бліжні Хобат, Далёкая Струга. А ў назвах трох балотных масіваў прысутнічае іх памер: Шырокае, [Вэлікэ Болото], Доўгае.

Вядома, што балоты ўтвараюцца шляхам зарастання як водных аб'ектаў – азёраў, старых рэчышчаў, рачных завадзяў, ручаёў, крыніцаў, так і сушы – лясоў, лугоў. Усё гэта адбілася і ў імёнах балотаў. Большасць з іх – аб'екты лясного варыянту: Барок, Алёс, Асаўцы, Бярэзіна, Дуб, Вэрбіна, Хваецкае, Борскае, Ліпкі, Яловае, Дубін Мох, Рэдкія Ляскі, Калінавы Куст, Рабінка, [Чарэцянка], [Борэцкэ], Сасноў Старадуб, Любажэрдзе, Ляскі, Корчыкі, [Котовы Олёс]. Назвы ад лугавых і балотных раслінаў: [Зелінскэ], Тросцян**е**ц, [Цваткі], Дрыстуха, Жураві**н**нэ, Ракіцянскае.

Ёсць назвы, намінатыўнымі для якіх з'яўляюцца зніклыя рэчкі, таксама прыкметы іх даўняй прысутнасці і нават упадзіны: [Морочнэ], Рэвух**а**, [Пэчыцкэ], [Рэчнэ], [Брочэ], Бр**о**дкі, Бродва, [**Я**мнэ], Котл**ы**, Халодная Струга, Карыцішча, Язвінка.

У назвах балотаў адбіліся і гіблыя месцы: Пагноі, Ч**а**днэ, Ліхі Востраў, Жлобіно, Пага**н**ішча, Глушкаўка, Глушка, Глажово, Брынянец, Гнойніца; і месцы з ветлымі імёнамі: Любашча, Шчадрыкі, Сіняе Балота, Сваха, Качайка. Акрамя Свахі, балотныя аб'екты маюць яшчэ некалькі «сваякоў»: Дз**е**дак, Бабіна Балота, Бабка, Машка, **Е**вінэ.

Спрадвечныя насельнікі балотаў – звяры і птушкі, таму і не дзіўна, што людзі далі назвы некаторым аб'ектам, відаць, з-за прысутнасці там у мінулыя часіны тых ці іншых відаў звяроў, птушак і рыб: Барсукі, Саміница, Лашуха, Звярынец, Чэрэпаха, Жураўлёва Балота, [В**о**ўчэно]. Рыбуня, П'явішнэ, Грыцукі, Собальска, Тхаравішча, Жабкі, Ваўкаўня, Валчанскае, Свініца, Чэрэпашкі, Чаплінэ Куп'е. Адзначаныя і месцы, звязаныя з промысламі нашых продкаў: [Лоўкі], Лоўчэ, [Погон**е**], Чаўнавішча, Граблішчэ.

У нашым рэльефе рэдка дзе ўбачыш узгоркі сярод балотных абшараў, а калі такія і маюцца, то надаюць назву гэтаму месцу. Напрыклад: Валкі, Горнава, Курган.

Учытваючыся ў найменні названых балотаў, адчуваеш, што ў іх няма ніякіх загадак, усе зразумелыя. А гэта таму, што славянскія. Славяне жывуць тут шмат стагоддзяў і, вядома, яны ўнеслі асноўны ўклад у нашую тапаніміку. Хаця ёсць невялікая колькасць і такіх назваў, што паводле сэнсу зразумелыя, але матыў надання аб'екта таго наймення невядомы: Пар**ы**, [Оступэц], Громава, [Посх**і**льскэ], Пэрсц**ы**, Сачэвічынава, Юркавічы, Крукін, [Хоц**я**тово], Саева, Купяцічы, Пляш'е, Ч**а**коў, Храпін, Падкалоддзе.

Маюцца назвы, пакінутыя нам, трэба меркаваць, нейкімі плямёнамі, што жылі ў даславянскі перыяд, і іх мова адрознівалася ад нашай. Так, Баба, [Чач**о**вэ] – каля ўрочышча Ч**а**ча, Бэрлёнэ, [Р**а**дэбно], Карасцін.

Сцяпан НЕФІДОВІЧ
(Паводле «Лунінецкага сшытка», 2012)

[1] Далей у назвах балотаў будуць пераважаць канчаткі -э, -о – важныя элементы палескай гаворкі.

[2] Назвы балотаў, у якіх пры мясцовадыялектным вымаўленні маецца значнае разыходжанне з нарматыўнай формай, далей будуць напісаныя ў квадратных дужках.

Край гарлачыкаў і валуноў

Пэўны час на Лепельшчыне дзейнічае Міжнародны праект «Земля, природа и люди в окружающем ландшафте: развитие устойчивого туризма в России и Беларуси». Каб удасканаліць яго дзейнасць, арганізатары з боку Нідэрландаў і Расіі наведалі Лепель. Шмат карысці прынёс праект развіццю экатурызму ў краі. Менеджар з боку Беларусі Вольга Маханенка вырашыла стварыць візіт-цэнтр на зялёным маршруце «Край жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў».

Пад час візіту галандскія і расійскія эксперты пазнаёміліся з турыстычным патэнцыялам Лепельшчыны, з традыцыямі беларускага народа і яго культурнай спадчынай і нават наведалі мерапрыемства «Вялікдзень у сям'і Кляшторных», арганізаванае ў Каменскай сельскай бібліятэцы-музеі паэта Тодара Кляшторнага. Супрацоўнікі бібліятэкі сумесна з сельскім домам культуры дапамаглі далучыцца ўдзельнікам праекта да традыцыяў беларускага народа, пазнаёмілі са святам Вялікадня і асаблівасцямі яго святкавання на Лепельшчыне.

Дзеля гэтага бібліятэка-музей на час ператварылася ў па-святочнаму прыбраную вясковую хату: стол накрыты самым прыгожым абрусам, на якім таксама прыгожы посуд, і акрамя фарбаваных яек і велікодных кулічоў – разнастайныя традыцыйныя стравы. Запрасілі гасцей у хату Гаспадары Тарас і Ганна і павіншавалі прысутных з Вялікднём. Павіншаваць гаспадароў завітала суседка Лявоніха, якая прынесла пасвечаныя яйкі, соль і пасху, расказала велікодныя прыкметы: традыцыйна пасвечанае яйка клалі ў свежую крынічную ваду і мыліся ёю, каб увесь год быць чыстымі і здаровымі. Потым да Гаспадароў завіталі маленькія валачобнікі з песнямі, якіх пачаставалі святочнымі стравамі, яйкамі, кулічамі ды іншымі прысмакамі. З вялікім задавальненнем далучыліся госці да велікодных гульняў, прапанаваных маленькімі гасцямі: «Качанне яек», «Біткі», «Даўбянка». Пасля шчодрыя Гаспадары запрасілі прысутных да велікоднага стала пакаштаваць традыцыйныя святочныя стравы, якія вельмі спадабаліся замежным гасцям, і падзяліліся сакрэтамі прыгатавання.

На памяць аб сустрэчы госці атрымалі «папкі-дасье»: дыск з віртуальным падарожжам па Каменскай сельскай бібліятэцы-музеі Т. Кляшторнага, буклеты бібліятэкі-музея і свята «Вялікдзень у сям'і Кляшторных».

Алена МАЗГО,
намеснік дырэктара сеткі бібліятэк
Лепельскага раёна

На фота: маленькія валачобнікі (уверсе) і ўдзячныя гледачы (унізе) у бібліятэцы-музеі – задаволеныя ўсе

«На "Пісьмянковым лузе" зноў талентаў парад...»

Два дні ў Касцюковічах доўжылася другое абласное свята паэзіі і аўтарскай песні «Пісьмянкоў луг». 24 мая ў актавай зале дзіцячай школы мастацтваў адбыліся паэтычныя «Пісьмянкоўскія чытанні». Ганаровай госцяй на свяце была жонка Алеся Пісьмянкова Алена Рыгораўна. Яна расказала пра гісторыю выдання апошняга зборніка вершаў мужа «Не знікай», пачытала найбольш любімыя ёю паэтычныя творы, выказала словы падзякі за сустрэчу з аматарамі яго творчасці.

Удзел у мерапрыемстве ўзялі вядомыя беларускія пісьменнікі з Гомеля А. Бардоўскі, А. Бароўскі, В. Ткачоў і паэтка-бард В. Цярэшчанка.

Яны падзяліліся добрымі ўспамінамі пра А. Пісьмянкова, пачыталі свае вершаваныя і празаічныя творы, а В. Цярэшчанка праспявала дзве цудоўныя песні.

Яшчэ адна творчая дэлегацыя прадстаўляла паэтычную Гомельшчыну. Паэт, бард, кіраўнік аматарскага клубнага аб'яднання «Арткафе на Иринской» Дзмітрый Нілаў пазнаёміў публіку з яго сябрамі, якія падзяліліся творчымі поспехамі, пачыталі ўласныя паэтычныя творы.

Шмат успамінаў і цёплых словаў пра свайго сябра і калегу А. Пісьмянкова прагучала ад пісьменніка Анатоля Зэкава. Яго выступленне было прасякнутае жартамі і гумарам, што спрыяла добраму настрою ў зале.

Родны бацькоўскі куток наведаў і У. Бурдзялёў, сын вядомага беларускага паэта А. Русецкага. Уладзімір Аляксеевіч выказаў падзяку арганізатарам свята за стараннасць у захаванні памяці паэтаў-землякоў, паведаміў пра моманты з біяграфіі і творчасці свайго знакамітага бацькі.

Удзел у свяце прыняў унук народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова У. Бербераў. Уладзімір Хрыставіч не чытаў вершы, ён падарыў усім старадаўнюю аўтэнтычную песню пад акампанемент такога ж гармоніка. «Я ніколі не чуў пра паэтычныя дынастыі, – сказаў музыка, – паэтычны талент у спадчыну не перадаецца, але імкненні да прыгожага, да мастацтва павінныя закладвацца з дзяцінства».

З Масквы на паэтычную сустрэчу прыехала паэтка Сняжана Холадава. Яе карані таксама з Касцюковіччыны, з гэтым невялікім мястэчкам звязаныя яе дзіцячыя ўспаміны, менавіта тут яна ўпершыню паспрабавала свае сілы на паэтычнай ніве ды шмат вершаў прысвяціла прыбесядскаму краю.

Парадавалі слухачоў і гаспадары свята – мясцовыя паэты, спевакі і музыкі. Паэтка Святлана Даськова прачытала свае новыя вершы, у тым ліку прысвечаныя памяці А. Пісьмянкова. Аўтэнтычныя песні, якія праславілі Ніну Бялугіну далёка за межамі раёна, прагучалі для ўсіх гасцей свята. Шматлікія слухачы і не падазравалі, што побач з імі жыве такая знакамітасць. Як пісаў А. Пісьмянкоў, спевамі Ніны Сымонаўны захапляліся ў свой час і Аляксей Пысін, і Ніл Гілевіч, і

Віктар Карамазаў. І да гэтага часу моцны голас цудоўнай спявачкі выклікае буру эмоцыяў і апладысментаў ад аматараў неўміручай аўтэнтычнай песні.

У мерапрыемстве прымалі ўдзел і самыя маладыя аматары паэзіі: удзельнікі народнага аматарскага аб'яднання «Літаратурная гасцёўня "Крынічка"» падрыхтавалі для гасцей музычна-паэтычны блок паводле творчасці паэтаў прыбесядскага краю і дзіцячых вершаў А. Пісьмянкова. У якасці музычнага суправаджэння дзеці абралі гітару. Гарманічна спалучаліся акорды гэтага інструмента з гукамі цудоўнай паэзіі.

На другі дзень праходзіў конкурс літаратурных выставак, дзе ўсе экспазіцыі мелі багаты літаратурна-краязнаўчы матэрыял: кнігі з аўтографамі пісьменнікаў, аўдыязапісы, метадычныя дапаможнікі, буклеты, медыяпрэзентацыі. А таксама адбыліся конкурсы выставак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, паэзіі, аўтарскай песні «На струнах сэрца». Усе пераможцы атрымалі памятныя статуэткі «Натхненне», зробленыя з каляровага шкла па эскізе касцюковіцкіх мастакоў.

З раніцы і да позняга вечара для гасцей свята працавалі гандлёвыя рады і выстаўкі-продажы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. На лузе можна было набыць шмат цікавых рэчаў: вырабы з каменю, рачныя ракавінкі і шмат іншага.

Гасцінна расчыніў дзверы «Сялянскі падворак», дзе не змаўкалі народныя песні ў выкананні вакальнага ансамбля «Сяброўкі» Сялецкаўскага СДК. Ветлівыя гаспадыні частавалі хатнімі прысмакамі і духмянай гарбатай.

Акунуцца ў атмасферу былога запрашалі ўдзельнікі касцюковіцкага клуба «Ратнік». Акцёры ў даспехах дэманстравалі рэканструкцыю рыцарскіх паядынкаў ранняга сярэднявечча. Уражанняў хапіла кожнаму. Шмат добрых водгукаў і пажаданняў прагучала ад гасцей і ўдзельнікаў свята. Кіраўнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Сінкавец лічыць, што «Пісьмянковаму лугу» трэба ўжо пашыраць маштаб, і паведаміў аб ідэях ў гэтым накірунку.

Можна сказаць з упэўненасцю, што ў наступным годзе вялікая пляцоўка «Пісьмянковага лугу» зноў збярэ творчых людзей з усіх куточкаў нашай краіны. Калі ласка, паважаныя паэты і выканаўцы, сардэчна запрашаем!

Наталля ДРОБЫШАВА,
г. Касцюковічы
Фота
Людмілы СМАЛЯКОВАЙ

Фотафакт

Любоў з Сямурадцаў

Часцяком даводзіцца бываць у розных вёсках Беларусі, сустракацца з тамтэйшымі людзьмі. Нядаўняя ж сустрэча запомніцца надоўга. Быў я ў вёсцы Сямурадцы, што ў Жыткавіцкім раёне. Зайшоў і ў мясцовую краму, дзе адразу ж адчуў сябе як у горадзе – чысціня, прыгажосць, вялікі выбар тавару. А галоўнае – прыветны прадавец Любоў Клімовіч, якая душэўна сустракае старога і малога, не толькі тавар прадае, але і дорыць цудоўны настрой.

Разгаварыліся з гаспадыняй крамы. Яна з маленства ўлюбёная ў свой палескі куточак, у свае Сямурадцы. А распавесці пра яе чытачам «Краязнаўчай газеты» хачу таму, што яна разам з мужам Уладзімірам цудоўна спявае дуэтам народныя песні, удзельнічае ў ансамблі «Сцвіжанка». А таксама дбайна ўпрыгожвае родную вёсачку, шчыруе на зямлі-карміцельцы. Растуць у сужэнцаў Клімовічаў два сыны – Віталік і Саша, годныя прадаўжальнікі справы бацькоў.

Шчыры дзякуй спн. Любові за ўсмешку і руплівасць на карысць землякоў. Яе душэўнасць буду памятаць заўсёды.

Мікола КОТАЎ, фалькларыст, пазаштатны карэспандэнт «Краязнаўчай газеты», фота аўтара

Прадаўжальнікі

Зачаравала песняй

Ёсць людзі, якія цікавяцца ўсім на свеце. І што яны ні паспрабуюць – у іх абавязкова атрымаецца. Вось з такіх і Аліна Максімовіч. Галоўная любоў у яе жыцці – песня. У школе Аля спявала ў мастацкай самадзейнасці, зачароўвала слухачоў песнямі «Ой иду и пою, и река поёт», «Ой хацела ж мяне маці за каваля замуж даці», прыпеўкамі. Песня і вызначыла яе лёс.

А. Максімовіч

Аліна Баляславаўна закончыла з адзнакай вучылішча і стала працаваць у Дзятлаве дырэктарам РДК. Неўзабаве выйшла замуж і пераехала ў Астрыну, дзе працавала метадыстам Дома культуры. Бадай, ні адно мерапрыемства не абходзілася без яе ўдзелу. Ніхто не заставаўся раўнадушным, слухаючы яе песні і прыпеўкі (Аліна Баляславаўна мае і паэтычны талент). І часам экспромтам можа дасціпным жартам высмеяць гультая ці ганарыстага начальніка. Выступала ў канцэртах, спявала сола, хорам, дуэтам. Са сваімі сёстрамі і маці арганізавала сямейны ансамбль, які выступаў на тэлебачанні. А яшчэ, будучы метадыстам, арганізавала агляд падворкаў. З навакольных вёсак з'язджаліся людзі, каб паказаць сябе і свой талент. Яны размяшчаліся ў парку Астрыны. Непаўторнай самабытнасцю вырабаў, разна-каляровым нацыянальным убраннем і, вядома, песняй вабілі людзей падворкі навакольных вёсак.

А вось пасля песні – кветкі. Хаця хто ж возьмецца раздзяляць гэтыя дзве рэчы. Кветкавод яна вельмі ўмелы і адданы. І, вядома, не магла змірыцца з тым, што кветкі маюць кароткі век. Стала займацца фларыстыкай. І, як і ва ўсім, дасягнула майстэрства. І не толькі сама. Аліна Баляславаўна вяла фларыстычны гурток «Пялёстак» і перадавала сваё майстэрства дзецям. Яе вырабы ўпрыгожвалі памяшканне мясцовага дома культуры.

Невыпадкова такому творчаму чалавеку было даручана ўзначаліць аддзел культуры Шчучынскага райвыканкама. Сваёй галоўнай задачай на пасадзе лічыла захаванне прафесійных кадраў, якія б маглі перадаць вопыт моладзі, навучылі дарыць людзям добры настрой, бачыць прыгожае. Цяпер Аліна Баляславаўна на заслужаным адпачынку, але ні на хвіліну нельга ўявіць яе ціхай і спакойнай пенсіянеркай.

Ганна СЦЯПАНЧАНКА, г.п. Астрына Шчучынскага раёна

Як у XX стагоддзі дзялілі Беларусь

(Заканчэнне. Пачатак у № 20)

У складзе ўрада, дзе не было ніводнага беларуса, усё беларускае лічылася контррэвалюцыйным, бо нагадвала пра БНР. ЛітБел была створаная Масквой як плацдарм для вайны з Польшчай, якая адрадзілася ў лістападзе 1918 года і ўжо ў лютым 1919-га дамовілася з немцамі на замену іх улады на сваю ў заходніх губернях Беларусі. Таму польскія войскі сталі рухацца на ўсход. Да сярэдзіны сакавіка яны ўжо занялі Слонім, Баранавічы, Пінск, 19 красавіка – Вільню, 8 жніўня – Мінск. Створаны Саветамі беларускі ўрад перабраўся ў Смаленск. Ленін прапанаваў палякам усю тэрыторыю ЛітБела за мірную дамову, бо змагаўся ў той час з Дзянікіным.

Але палякам было гэтага мала – яны жадалі яшчэ левабярэжную Украіну. У красавіку яны рушылі на Кіеў. Саветы кінулі туды лепшыя войскі, і палякі адступілі, русія ж, наадварот, «папёрлі» з лозунгамі «Даёшь Варшаву». Бальшавікі дайшлі да Варшавы, але там атрымалі паразу, бо Польшчы дапамаглі краіны Антанты (Англія, Францыя).

Трэці і чацвёрты падзелы нашых земляў адбыліся ў 1920-м. 12 ліпеня Ленін заключае з Літвою мірную дамову і аддае ёй Вільню, Гродна, Шчучын, Ліду, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў. Так Масква дабілася канфрантацыі паміж Літвой, Польшчай і БНР. У жніўні 1920-га паводле дамовы з Латвіяй ёй аддалі часткі Віцебскай губерні (Дзвінскі, Рэжыцкі, Люцінскі, сучасныя – Даўгаўпілс, паветы Рэзэкнэ і Лузду).

Пяты падзел адбыўся згодна з Рыжскай дамовай у сакавіку 1921 года паміж Расіяй і Польшчай. Згодна з ёю Масква аддала Варшаве заходнія землі Беларусі. Мяжа пралягла праз Негарэлае (40 км ад Мінска). БССР пакінулі толькі 52 000 км² з насельніцтвам 1,3 – 1,6 млн чалавек (паводле Карскага беларусаў на пачатку XIX стагоддзя было 12 млн). Такая дыспрапорцыя і незадаволенасць беларускіх нацыянальна-вызваленчых арганізацыяў прымусіла маскоўскую ўладу да пэўных крокаў, і таму ў сакавіку 1924-га былі вернутыя часткі Віцебскай і Магілёўскай абласцей (без Веліжскага, Невельскага, Себежскага раёнаў), а таксама часткі раёнаў Смаленскай і Гомельскай абласцей (што былі да 1 студзеня 1919-га). У снежні 1926 года па просьбе кіраўнікоў Беларусі былі вернутыя са складу Украінскай ССР толькі два паветы – Гомельскі і Рэчыцкі. У выніку тэрыторыя БССР склала 125 000 км², а насельніцтва – амаль 5 млн чалавек.

У 1939 годзе адбылося ўз'яднанне з Заходняй Беларуссю, але згодна з Маскоўска-Ковенскай дамовай ад 7 кастрычніка 1939-га Вільня разам з Віленшчынай былі адрэзаныя ад Беларусі і аддадзеныя Літве.

Сёмы падзел быў здзейснены ў 1940-м, калі на загад Масквы ад Беларусі былі забраныя на карысць Літвы Свянцяны, Салечнікі, Друскенікі. Восьмым падзелам можна лічыць пацвярджэнне гэтых зменаў немцамі ў 1941–1944-х. Дзявяты падзел адбыўся ў 1944–1950 гадах, калі на карысць Польшчы (зноў жа Масквой, без згоды беларусаў) былі аддадзеныя землі Беласточчыны, а таксама шэраг тэрыторыяў Гродзеншчыны.

Такім чынам, толькі ў XX стагоддзі, не лічачыся з нашымі нацыянальнымі інтарэсамі, Масква шматкроць перакройвала этнічныя землі беларусаў – нашыя спаконвечныя землі. Братэрства ў дзеянні?

Людміла ЛІТВІНАВА

«Рандэву». Карыкатура Дэвіда Ло, надрукаваная ў брытанскай газеце «Evening Standard» 20 верасня 1939 года, паказвае Гітлера і Сталіна пасля падзелу Польшчы. Гітлер: «Ашмецце чалавецтва, калі не памыляюся?» Сталін: «Крывавы забойца працоўных, я мяркую?»

Межы Беларускай ССР на 1 студзеня 1941 г.

Пах дзяцінства

Надоўга ў маёй хатняй бібліятэцы большасць кніг Якава Тайца не затрымлівалася. А прычына гэтаму самая празаічная: у асноўным тоненькія, у мяккай папяровай вокладцы, гэтыя кніжачкі чыталіся самымі маленькімі. І не заўсёды, на вялікі жаль, мелі адпаведнае абыходжанне. Праўда, часам, перабіраючы старыя кніжкі, натрапляеш і на іх – кідкіх, уражлівых сваімі вокладкамі. Зірнеш, здавалася б, на дастаткова просты малюнак – і перад вачыма ўзнікае процьма светлых і добрых асацыяцыяў, створаных творчай фантазіяй нашага земляка, пісьменніка Якава Тайца, які нарадзіўся ў Смаргоні ў 1905 годзе.

У кнізе персаналіяў «Людзі культуры з Гродзеншчыны» даследчык лёсаў нашых землякоў Аляксей Пяткевіч расказвае пра Якава Тайца і яго бацьку – яўрэйскага пісьменніка Майсея Тайца, які нарадзіўся ў мястэчку Вартачы Астравецкага раёна. Тайц-старэйшы (нарадзіўся ў 1882 годзе, памёр у Маскве ў 1935-м) пісаў на ідышы. Друкаваўся з 1902 года. У Маскве выйшлі яго паэма «Кніга хронік», зборнік вершаў «Далоні да сонца» (1923), раманы «Смерць таварыша Вулі» (1929), «Інфузорная зямля» (1931). Дзве кнігі і назвамі звязаныя з Беларуссю – зборнік апавяданняў «Кара Смаргоні» і паэма «Беларусь». Абедзве пабачылі свет у 1930-м, але і ў іншых творах Тайца-старэйшага хапае беларускіх сюжэтаў.

Сваю дарогу ў літаратуру сын пісьменніка пачаў напрыканцы 1920-х – у 1930-м. Першая кніга – зборнік апавяданняў «Крыўдная каманда» выдадзеная ў 1931 годзе. А вось літаратурным заняткам папярэднічалі іншыя клопаты. Бацькоўская пісьменніцкая праца была не дужа прыбытковая. Даводзілася часта пераязджаць, ды й М. Тайц яшчэ ўдзельнічаў у рэвалюцыйным руху (здаралася, што трапляў пад арышт). З 1917 года сям'я жыла ў Харкаве. Тады гэты горад быў сапраўдным цэнтрам літаратурнага, культурнага, мастацкага жыцця ва Украіне. Якаў паступіў у мастацкую школу. А ў 1920-м разам з бацькамі пераехаў у Маскву. У 1929 годзе скончыў Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут – славуты «ВХУТЕМАС». Аднакашнікі Якава сталі славутымі архітэктарамі: Георгій Шчуко (1905–1960) разам з групай калег ужо ў 1932–1933 гадах праектаваў Палац Саветаў у Маскве; Леанід Палякоў (1906–1965) за праекты розных ваенных аб'ектаў двойчы быў адзначаны Сталінскімі прэміямі (у 1949 і 1950 гадах); Уладзімір Гайковіч (закончыў «ВХУТЕМАС» на год раней – у 1928-м) праектаваў новыя раёны Сталінабада (у 1931–1938; да гэтага часу і цяпер – Душанбе), Баку (у 1936–1938), іншых вялікіх гарадоў СССР. А вось Якаў пасля заканчэння вучобы працаваў цынкографам у друкарні. Затым служыў у войску, а пасля заняўся афармленнем кніг.

Ды ўжо першыя публікацыі пераканаўча паказалі, што галоўным клопатам жыцця павінна стаць літаратура. Прычым літаратура, адрасаваная дзецям ці напісаная пра дзяцей. Следам за зборнікам «Крыўдная каманда» выходзяць кнігі «Аповед сігнальшчыка» (1931) і «Сігнальшчык» (1933), «Два апавяданні» (1935) і «Адкуль ты?» (1935). Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны з'явілася яшчэ ці не з дзясятак кніг: «Антон і Антонаўна», «Кубік на кубік», «Артэк», «Каўнерык», «Дом», «Апавяданні», «Залаты грошык», «Руды камень». У 1936 годзе Яўгенія Таратута выступіла ў часопісе «Детская литература» з грунтоўнай рэцэнзіяй «Маленькія апавяданні Я. Тайца». Ужо тады крытыкам было зразумела, што ў межах малой формы, у межах кароткага апавядання пісьменнік здольны сказаць галоўнае, здольны выканаць важную місію дзіцячай літаратуры – даць урок дабрыні, справядлівасці, навучыць юнага чытача з піэтэтам ставіцца да дарослых, любіць прыроду.

Я. Тайц

2006 год – выходзіць дастаткова тыражная кніга, дзе разам сабраныя творы Леаніда Панцялеева, Віталія Біянкі, Барыса Жыткова, Вольгі Высоцкай і Я. Тайца. А ў 1989 годзе кніга нашага земляка пад назвай «Дом» пабачыла свет у маскоўскай «Детской литературе» накладам 2 мільёны асобнікаў (!). «Мой першы букет» выходзіла пасля смерці аўтара тройчы – у 1967, 1970, 1989 гадах. Толькі ў 1958-м, калі Якава Майсеевіча ўжо не стала, адна за другой да чытача прыйшлі тры ёмістыя зборнікі яго прозы: «Нязгаснае святло», «Савецкай краіны піянер», «Салдацкі подзвіг». Гартаючы гэтыя кнігі сёння, пераконваешся, што іх варта перачытаць і дарослым. Напісанае ўраджэнцам Смаргоні – гэта якраз дзіцячая літаратура, разлічаная і на дарослых. І не толькі таму, каб яны нешта выбралі для дзецей і ўнукаў, а яшчэ і таму, каб самі дакрануліся да цяпла, святла, дабрыні, пяшчоты і спагады. Пра створаную пасля Вялікай Айчыннай вайны аповесць «Пад гарой Гедыміна» Ірына Цыпіна з Ізраіля на адным з інтэрнэт-парталаў напісала: «*Кнігу Якава Тайца мне падаравала мая бабуля са словамі: "Ён з таго самага горада Вільня, дзе я нарадзілася і жыла да вайны, магчыма, мы былі знаёмыя..."; "... часам на хвалях памяці прыходзяць вобразы з дзіцячых гадоў..."*». А хіба не самае вялікае шчасце даросламу спрычыніцца да дзяцінства?! Галоўнае, што ў многіх чытачоў складваецца ўражанне суладнасці, блізкасці з прачытаным, з самім пісьменнікам, праяўляецца давер да аўтара. Таму, відавочна, і «савецкія» творы Я. Тайца перавыдаюць цяпер, калі ўжо не ў модзе і слова «савецкі».

Юрый Якаўлеў у 1970 годзе надрукаваў у калектыўным літаратуразнаўчым зборніку «Дзіцячая літаратура» артыкул пра Я. Тайца, дзе былі і такія словы: «*Яго выратоўваў сардэчны кругагляд. Яго выратоўвалі ўдачы сяброў...*». Так, шмат хто падкрэсліваў пасля смерці Якава Майсеевіча, што гэты знешне няўклюдны чалавек, досыць сціплы, умеў адкрывацца ў адказ на чужую шчырасць, чужую дабрыню. Умеў радавацца поспехам сваіх таварышаў-аднагодкаў. Стараўся выказаць падтрымку літаратурнай моладзі. Не выпадковым падаецца і тое, што ў асабістым фондзе пісьменніка ў Расійскім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваюцца лісты Я. Тайцу ад Анатоля Алексіна, датаваныя пачаткам 1950-х. Тады будучы славуты літаратар рабіў першыя крокі ў літаратуры. У 1950–1955 гадах выходзілі першыя яго апавяданні, першыя кнігі: «Маленькая Лайма», «Два партрэты», «Светлая дарога», «Блізкі горад», «Два падарункі», «Ідуць дажджы». Як мне падаецца, ёсць у гэтых творах А. Алексіна нешта ад мастацкіх урокаў Я. Тайца. З Якавам Майсеевічам ліставаўся малады Сяргей Баруздзін. Ён таксама пачынаў як дзіцячы пісьменнік. У 1950 годзе ў сааўтарстве з А. Алексіным выдаў зборнік вершаў «Сцяжок». І наступныя кнігі С. Баруздзіна адрасаваныя дзецям: «Хто пабудаваў гэты дом», «Пра Святлану», «Хто сёння вучыцца».

Ёсць яшчэ і загадкі з беларускіх старонак жыццяпісу Я. Тайца, вартыя ўвагі. У адной з крыніцаў мімаходзь гаворыцца, што Якаў Майсеевіч уваходзіў у склад Усебеларускага аб'яднання (асацыяцыі) мастакоў. Ці так гэта на самой справе? І калі, у якія гады такая повязь з роднай Беларуссю мелася? Падставы на тое, канечне ж, былі самыя што ні ёсць поўныя. Якаў Майсеевіч і сам ілюстраваў уласныя кнігі, і працаваў як мастак для душы, для ўласнага самавыяўлення.

Круг творчага жыцця Якаў Майсеевіч завершыў цыклам навелаў «Нязгаснае святло» – пра ўласнае дзяцінства, а надрукаваныя яны былі пасля яго смерці ў 1958 годзе. Займальныя, сюжэтныя, напоўненыя тонкім гумарам, яны дапаўняюць той вобраз пісьменніка, што склаўся з папярэдніх кніг.

Захаваліся тэлеграмы-спачуванні ў сувязі са смерцю літаратара ад Канстанціна Сіманава, Самуіла Маршака, Мікалая Ціханава, Канстанціна Федзіна, Сяргея Міхалкова, Карнея Чукоўскага. Пайшоў з жыцця наш зямляк 4 красавіка 1957 года ва ўзросце 52 гадоў.

Мікола **ПРЫТЫКА**

У тэатры «Зьніч»

Са шляхоў Сыракомлі

У Малой зале імя Рыгора Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбылася юбілейная паэтычна-музычная імпрэза «Я – літвін», прысвечаная 190-годдзю Уладзіслава Сыракомлі. Тэатральна-канцэртны праект «Час і постаці» арганізаваны Беларускім паэтычным тэатрам аднаго акцёра «Зьніч» (дырэктар і мастацкі кіраўнік Галіна Дзягілева).

Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч) – грамадскі дзеяч, паэт, празаік, публіцыст, гісторык, краязнаўца. Постаць, амаль забытая ў сучаснай беларускай гісторыі, з'явілася на сцэне Белдзяржфілармоніі яркай паходняй ва ўсёй сваёй велічы таленту і адданасці роднаму краю.

Упершыню на беларускай мове на самым пачатку вечарыны ***прагучаў раманс «Ямшчык»*** у выкананні Андрэя Марозава (барытон) у перакладзе Кастуся Цвіркі. Гэта была цудоўная прэм'ера песні.

Праграма складалася з 2-х аддзяленняў, дзе гучалі ўрыўкі з кнігі К. Цвіркі «Лісце забытых алеяў», якая змяшчае ўспаміны Сыракомлі і думкі аўтара пра неардынарны талент славутага беларуса. Вечарына была аздобленая выдатнымі музычнымі творамі ў выкананні Таццяны Шумаковай (цымбалы) і Наталлі Сазановіч (фартэпіяна). Тэксты чыталі Уладзімір Рагаўцоў і Галіна Дзягілева. На сцэну праектаваліся працы народнага мастака Беларусі Гаўрылы Вашчанкі, а таксама малюнкі Напалеона Орды і Уладзіслава Сыракомлі.

Усё гэта дапамагала пачуць словы Сыракомлі, звернутыя да нашчадкаў, словы шчымлівыя, праўдзівыя ў сваёй гістарычнасці, таленавітыя ў сваёй паэтычнасці, пранікнёныя ў сваёй сардэчнасці.

Дзякуй усім гістарычным асобам гераічнага XIX стагоддзя, якія дагэтуль з'яўляюцца таямніцай натхнення нашых сучаснікаў!

Галіна **ХІНКА-ЯНУШКЕВІЧ,** *мастак-графік, сябра Саюза мастакоў Беларусі*

Памяць сэрца

Вайна. Сёння мы ўяўляем яе па ўспамінах ветэранаў, кадрах кінахронікі, па творах мастацкай літаратуры. Памяць людская адлітая ў бронзе помнікаў, жыве ў сэрцы кожнага, хто прайшоў праз пекла фашысцкага палону, хто знайшоў у сабе сілы выжыць і расказаць сёння, што такое фашызм, што такое вайна.

Ф. Анасовіч (Кучко)

Н. Радзевіч

Не абмінула страшэнная віхура і Вілейшчыну. За гады акупацыі на яе тэрыторыі фашысты спалілі больш за 49 вёсак, пяць – з людзьмі: Боркі, Любча, Брыгідава, Старынкі і Гасцілава. Боркі і Любча былі спаленыя 5 мая 1943 года. Сёлета споўнілася семдзесят гадоў з гэтай жудаснай трагедыі. Шмат прайшло часу з той пары, але і сёння ў сэрцах людзей болем адгукаюцца падзеі страшнай вясны 1943-га.

7 мая шмат людзей сабралася на мемарыяльным комплексе «Любча»: прадстаўнікі Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь, Мінскага абласнога аддзела грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру», Вілейскага райвыканкама, Вілейскага раённага Савета дэпутатаў, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, воіны-інтэрнацыяналісты, навучэнцы і настаўнікі Ільянскай, Залескай, Хаценчыцкай школаў, гімназіі № 2 г. Вілейкі, Ільянскага аграрнага каледжа і інш. Прысутныя ўшанавалі памяць спаленых вёсак: прайшоў мітынг-рэквіем, на якім выступіла старшыня Вілейскага раённага Савета дэпутатаў Наталля Радзевіч, успамінамі падзялілася жыхарка вёскі Рабунь Фаіна Сяргееўна Анасовіч (Кучко), якая неверагодным чынам засталася жывой, калі карнікі палілі Боркі; прагучала літаратурная кампазіцыя ў выкананні навучэнцаў гімназіі № 2 г. Вілейкі; ксёндз і бацюшка памаліліся за супакой тых, хто пацярпеў ад рук фашыстаў, асвяцілі адрамантаваны помнік у Борках.

Затым удзельнікі мітынгу накіраваліся ў Ільянскую сярэднюю школу. Тут іх ветліва сустракалі навучэнцы і настаўнікі. У народных музеях «Ільянскія далягляды» і «Вілейшчына літаратурная» вучні правялі тэматычную экскурсію «Вогненныя вёскі Вілейшчыны».

А сабліва ўсхвалявала ўсіх мерапрыемства, праведзенае ў актавай зале школы. Не пакінула нікога абыякавым выступленне Наталлі Кірылавай, каардынатара праекта «Павышэнне статуса ўратаваных жыхароў спаленых беларускіх вёсак у 1941–1944 гадах», укладальніка кнігі «Зимнее волшебство. Нацистская карательная операция в белорусско-литовском пограничье, февраль – март 1943 года». На тварах прысутных можна было пабачыць слёзы, калі выступленне суправаджалася дэманстрацыяй дакументальнага фільма аб трагедыі беларускага народа пад час нацысцкай карнай аперацыі. Тое, што бачылі з экрана, болем адгукалася ў сэрцы кожнага.

Галоўны архівіст НГАБ Вячаслаў Селяменеў у сваім выступленні засяродзіў увагу на электроннай базе дадзеных «Белорусские деревни, сожжённые в годы Великой Отечественной войны». Ён звярнуўся да нас па дапамогу ў зборы звестак, звязаных з гэтаю тэматыкай.

Напрыканцы мерапрыемства са словамі падзякі выступіла намеснік старшыні Вілейскага райвыканкама Святлана Дзяруга, якая зазначыла, што бачыла слёзы на вачах не толькі ў дарослых, але і ў дзяцей. А гэта значыць – боль аб трагедыях вайны будзе адгукацца і жыць у памяці і сэрцах.

Валянціна ЕРАШОНАК
Фота Васіля і Матвея ШЭРЫХ

Мне ўсё часцей вярэдзіць душу памяць, – успаміны пра тых людзей, якіх напаткаў складаны лёс, а пра іх расказвалі бацькі, вяскоўцы. Час няспынна ідзе наперад, шмат чаго забываецца, сціраецца з памяці. Амаль усе героі аповеду пакінулі гэты свет. Але засталася радня, якая таксама, магчыма, не ведае, якія жахі перажылі іх блізкія, праз якія пякельныя колы пакутаў яны прайшлі. Вось мне і падумалася: калі не напішу тое, што ведаю, не пакіну нашчадкам памяць пра былое, то кануць у вечнасць падзеі, пра якія забывацца нельга. Хацелася б, каб чытач зразумеў мяне, – сёння вельмі балюча прыгадваць многае з таго, што перажылі знаёмыя і блізкія мне людзі. Аднак жа... У маладосці неяк не надавала гэтаму асаблівага значэння, а цяпер хачу выправіць памылку. Ведаць пра тое, што і як адбывалася ў нашых мясцінах – наш абавязак, землякі. Таму і прапаную чытачам «Краязнаўчай газеты» ўрыўкі з дакументальнай аповесці.

Маёнтак Казлоўскіх

Калі тэрыторыю царскай Расіі (цяпер называную Заходняй Беларуссю) напаткаў крызіс 1900 – 1908 гадоў, родныя браты Казлоўскія Гілярый, Фэлікс, Юзаф, Донат і Антоній з цяперашняй Мёршчыны паехалі працаваць у Канаду, каб затым на радзіме выкупіць зямлі і ўзвесці свой маёнтак. Па вяртанні выпытвалі, ездзілі, аглядалі ўчасткі, каб падабраць такое месца, дзе можна пабудаваць трывалае ўласнае гняздо – адно на ўсіх пяцярых. Нарэшце, трапілі ў такую мясцовасць, дзе хлопцы ў адзін голас сказалі: «Гэта наша!» І, сапраўды: вялікая па плошчы, нікім не заселеная зямля, побач працякае, выгінаецца рэчка Янка, за пару кіламетраў – журавіннае балота, крыху далей – лес. Вёска далекавата, хутароў паблізу няма. Выкупілі зямельны ўчастак плошчаю 50 гектараў.

– Галоўнае, што лес блізка, значыць, будзе з чаго будаваць, – разважалі і радаваліся браты. – І зямля ўрадлівая – чарназём. Усё, што нам трэба, – задаволена пацёр далоні старэйшы Гілярый. Назвалі маёнтак Паянчы ад ракі Янка (потым вёску, што непадалёк узвядуць, назавуць Паянычы; цяпер у Шаркаўшчынскім раёне).

Нанялі вопытных цесляроў і будаўнікоў з вясковых сялянаў. Майстравыя людзі і самі гаспадары цюкалі сякерамі цэлы дзень, звінела піла, пакуль на двары не сцямнее. Спачатку бёрна за бёрнам, вянец за вянцом клаліся з даспелага лесу сцены, стаў вырастаць асноўны вялізны будынак на два канцы. Узвялі сцены, абчасалі на гладкі вугал. Па мясцовых традыцыях, як толькі паставілі кроквы, на вяршыні прымацавалі збітую з драўляных калочкаў зорачку, упрыгожылі яе сплеценым з палявых кветак вяночкам. Адзначылі падзею шырокім застоллем, частавалі будаўнікоў.

Дах накрылі гонтам, будынак ашалявалі гладкімі, не пафарбаванымі дошкамі, на вокны зрабілі разбяныя ліштвы. Адштукавалі хату – узяліся за ўнутраныя работы.

Каб зайсці ў будынак з вуліцы, спачатку трапляеш у невялікі ганак (веранда, метры чатыры на пяць), амаль на паўсцяны абапал - шмат вокнаў з рознакаляровага шкла. Упрытык да бакавых сценаў ганка нерухома да сценаў прымацавалі дзве шырокія і тоўстыя лаўкі з узорамі. Прайшоўшы праз ганак, адчыняюцца ўважыстыя двухстворкавыя дзверы з каваным вялізным кручком і магутным вухам, каб на ноч надзейна зачыняцца. З высокага парога ганка ступаеш у вялізныя сені, што дзеляць хату на дзве часткі. Па правы бок – чыстыя пакоі, як сёння кажам, зала, па левы – пакоі для прыслугі. У адным і другім – мурнікі склалі па печы з чырвонай цэглы, абтынкавалі клейкай глінай, што ёсць у тых мясцінах. Як добра прасохлі, пабялілі вапнай. Столь падтрымлівалі габляваныя (з самых тоўстых, што нарыхтавалі, бэлек) круглыя маціцы. Сцены паклеілі рознакаляровымі шпалерамі, кожны пакой па-рознаму. З мэблі штосьці гаспадары прывезлі з Польшчы, а крэслы, лаўкі, шафы зрабілі мясцовыя майстры.

Затым узвялі будынак для сталовай, бліжэй да рэчкі – лазню па-чорнаму, непадалёк выкапалі студню, далей ад дома пабудавалі даўжэзны хлеў, свіран.

Вакол фальварка садоўнікі ў тры шэрагі пасадзілі вішняк, па шнурочку з поўначы на поўдзень размясцілі фруктовы сад, бліжэй да хаты – пладовыя кусты. Каля ганка пад вокнамі жанчыны, якія там працавалі, зрабілі клумбы і пасадзілі садовыя кветкі. Па плоце віўся духмяны гарошак.

(Працяг на стар. 8)

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 7)

Прывёз Гілярый з паўднёвых краёў нябачаных птушак. Дзівіліся мясцовыя, як важна хадзілі па двары паўліны і прыручаныя фазаны. А ў стайні ўтрымлівалі коней. Антоній любіў іх, меў уяўленне аб племянной справе і заняўся развядзеннем пародзістых жарабцоў.

Шэсць дзён людзі па найму працавалі ў гаспадароў, а ў нядзелю для ўсіх быў выходны. Казлоўскія запрагалі ў фурманкі па пары коней, надзявалі ім на шыю хамут з шумёламі, выязджалі на кірмаш, у касцёл. Былі дні, калі на рысаках – на паляванне. Так іх складвалася жыццё, што ўсе мужчыны маёнтка, акрамя Фэлікса, заставаліся халасцякамі. Чаму? Хто ведае? Магчыма не знайшлі тых, якія б былі сэрцу мілыя, а можа таму, што за штодзённымі жыццёвымі клопатамі часу не хапала на выбар суджанай?

Самі гаспадары ўдзельнічалі ў розных справах, працавалі фізічна. Нават вучылі жанчын, як спрытна і хутка можна жаць жыта. Бывала, займуць паласу спелай збажыны. Серп у рукі і наперад! Пот цурком з ілба ліецца, а яны жнуць, галавы не падымаючы. Сорамна жанчынам адставаць ад іх. Вось так, уласным прыкладам, прымушалі працаваць іншых. Усе былі занятыя няспыннымі клопатамі пра хлеб. Харчаваліся разам за вялізным сталом, што стаяў на кухні сярод хаты. Гаспадыні, якія працавалі тут, перад тым як падрыхтаваць абед для тых, хто працаваў у полі, мылі драўляны не пафарбаваны стол так, каб аж блішчэў, як новенькі, і пахла ад яго лесам. Засцілалі бялюткім кужэльным настольнікам. Кожны ведаў сваё месца за сталом. Як можна было дзяліць стравы для багатых і бедных, калі яны гатаваліся для ўсіх з адных і тых жа прадуктаў, вырашчаных на зямлі ўласнымі рукамі?! Тут толькі смак страваў залежаў ад гаспадыні, якая гатавала іх. Паўсядзённай ежай былі смажаная на сале бульба, дранка са шкваркамі (сарока), клёцкі «з душамі», салёныя гуркі з бочкі, капуста, салёнае сала, дранікі, малако, маслянка, гарбата з духмяных зёлак. Строга захоўваліся ўсе рэлігійныя святы і пасты. Казалі, што калі пасціцца хоць бы па два дні на тыдзень (серада і пятніца), можна

Браты Гілярый, Юзаф, Антоній, Донат і Фэлікс Казлоўскія з прыслугаю перад сваім домам

пазбегнуць усыхання мозгу ў пажылым узросце, абараніцца ад хваробаў сэрца, дыябету і нават раку, зменшыць запаленне і атлусценне.

...Назваць гаспадароў фальварка кулакамі можна толькі таму, што, умоўна кажучы, яны спалі на кулаку, напрацаваўшыся за дзень. А тое, што мелі больш за іншых зямлі і грошай, дык гэта дзякуючы іх мудрасці і працы да поту, строгімі падлікамі выгадных і прыбытковых справаў. А як жа гэтаму зайздросцілі тыя, у каго так не атрымлівалася! Зайздрасць часцяком не дае спакою тым, хто мае магчымасць адабраць, перамяніць жыццё па сваіх законах, хто лічыць, што яго законы самыя справядлівыя.

(Працяг будзе)

Чэрвень

20 – Вашчанка Гаўрыла Харытонавіч (1928, Брагінскі р-н), жывапісец, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1987) – 85 гадоў з дня нараджэння.

20 – Кавалёў Сяргей Валер'евіч (1963, Магілёў), драматург, літаратуразнаўца, крытык – 50 гадоў з дня нараджэння.

21 – Майхровіч Сцяпан Казіміравіч (1908, Слуцкі р-н – 1981), крытык, літаратуразнаўца – 105 гадоў з дня нараджэння.

22 – Авечкін Аляксандр Аляксеевіч (1913, Расія – 1980), празаік, дзіцячы пісьменнік – 100 гадоў з дня нараджэння.

22 – Цвікевіч Аляксандр Іванавіч (1883, Брэст – 1937), палітычны дзеяч БНР і БССР, гісторык, філосаф, публіцыст – 130 гадоў з дня нараджэння.

25 – Шклярэўскі Ігар Іванавіч (1938, Бялынічы), паэт, перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1987), Дзяржаўнай Пушкінскай прэміі (Расія; 1999), кавалер ордэна Дружбы народаў – 75 гадоў з дня нараджэння.

27 – Вярсоцкі Віктар Іванавіч (1923–2004), жывапісец, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

27 – Рудзько Юрый Герасімавіч (1913, Бабруйск – 1948), празаік, драматург, нарысіст – 100 гадоў з дня нараджэння.

28 – Пашкін Юрый Андрэевіч (1933, Расія – 1992), тэатразнаўца, гісторык тэатра, крытык – 80 гадоў з дня нараджэння.

28 – Чантурыя Уладзімір Аляксандравіч (1923–1988), гісторык архітэктуры, педагог, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980), аўтар навуковых працаў па гісторыі беларускай архітэктуры – 90 гадоў з дня нараджэння.

29 – Рудзік Пётр Сафронавіч (1913–2005), заслужаны архітэктар Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

30 – Ваніцкі Арсеній Мікалаевіч (1933, Баранавіцкі р-н – 2001), дзяржаўны і грамадскі дзеяч, заслужаны работнік культуры Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 20

Уздоўж: 1. Лібава. **4.** Боцман. **6.** Марс. **7.** Брыг. **9.** Інданезія. **11.** «Шапка». **13.** Услон. **15.** Крона. **16.** Індыя. **17.** Кітай. **18.** Ацтэк. **20.** Мачта. **21.** Зямля. **26.** Настаўнік. **28.** Зубр. **29.** Яхта. **30.** Анкерок. **31.** Цэйлон. **32.** Італія.

Упоперак: 2. Борт. **3.** Агент. **4.** Боцік. **5.** Марк. **6.** Маршак. **8.** Гвінея. **10.** Не. **12.** Кантакт. **14.** Санкцыя. **17.** Камбуз. **19.** Клякса. **22.** Каран. **23.** Канец. **24.** Віскі. **25.** Збой. **27.** Схіл.

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

Настаўнік:

– Чаму ўрокі прапусціў?

Вучань:

– Дровы калоў.

– Заўтра пачынаюцца канікулы, от бы тады і калоў.

– На канікулах я буду іх рэзаць...

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

МІФАЛАГІ́ЧНЫЯ ВО́БРАЗЫ ў беларускім фальклоры – суадносіны паміж фальклорам і міфалогіяй як гістарычнымі формамі духоўнай культуры – важная праблема этнаграфіі і фалькларыстыкі. Прадстаўнік міфалагічнай школы А.М. Афанасьеў імкнуўся выявіць міфалагічныя адпаведнікі або архетыпы сюжэтаў, вобразаў, матываў, мастацкіх сродкаў усіх жанраў славянскага фальклору і звязаных з ім абрадаў. Самую міфалогію тлумачыў з пазіцыяў натуралістычнай і сімвалічнай тэорыяў, паводле якіх міф – гэта паэтычнае ўвасабленне прыродных ці касмічных з'яваў і па сваёй сутнасці з'яўляецца першабытнай формай мастацкай творчасці. Пазней, у пач. XX ст., заснавальнік «псіхалагічнай» тэорыі міфа В. Вунт бачыў у міфатворчасці найважную функцыю фантазіі, фальклору, паэзіі, інш. відаў мастацтва. Прадстаўнікі этналагічнага кірунку ў культуралогіі Л. Леві-Бруль, Дж. Фрэзер і інш. супрацьпаставілі «пралагічную» сутнасць міфа сучаснаму навуковаму і мастацкаму спазнанню. Разам з тым яны перанеслі ўвагу даследчыкаў з вобразнай сістэмы міфалогіі на тыя інстытуты старажытнага грамадства і адпаведныя ім абрады, якія спарадзілі міфы. Важкі ўклад у пераадоленне вульгарнага сацыялагізму ў фалькларыстыцы ўнёс М.М. Бахцін, які раскрыў эстэтычную спецыфіку народнай творчасці, яе своеасаблівы метад «гратэскавага рэалізму». Эстэтычная тэорыя фальклору дае магчымасць выявіць істотнае адрозненне паміж міфалагічнай топікай (наборам сюжэтаў) і яе фальклорнымі аднаведнікамі, што ў працэсе мастацкай эвалюцыі страцілі сваю міфалагічную сутнасць, пераўвасобіліся ў мастацкія тропы і інш. сродкі эстэтычнага выяўлення і духоўнага асэнсавання быцця.

Міфалагічныя вобразы і матывы багата прадстаўленыя ў беларускім фальклоры. Іх колькасць і эстэтычныя функцыі неаднолькавыя ў розных відах і жанрах народнай творчасці: найбольш у чарадзейных казках, казках пра жывёлаў, легендах і паданнях, шмат у баладах, абрадавых песнях, загадках і найменш у сацыяльна-побытавых казках, прыказках, жартах і гумарэсках. Спецыфічна казачным пераўтварэннем міфалагічных вобразаў з'яўляецца іх карнавалізацыя – перавод узнёсла-велічных, сур'ёзных і страшных сюжэтаў і матываў у «матэрыяльна-цялесны ніз» або ў камічна-побытавы план. Фальклорная травестацыя міфалагічных уяўленняў закранае нават універсальныя формы быцця – прастору і час. У сістэме міфалагічнага светапогляду прастора ўяўляецца вонкавай рэалізацыяй Бога-творцы, жывым космасам, які мае свой верх (неба), сярэдні свет (зямлю) і падземнае царства (пекла). У чарадзейнай казцы міфалагічная прастора травестуецца, падпарадкоўваецца людской волі.

(Працяг артыкула ў наступных нумарах)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 06.06.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 506.
Тыраж 1030 асобнікаў.